***У.І. Рынкевіч,*** *дацэнт*

# БЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ СПАДЧЫНА ЯК ДЫДАКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ У ВЫВУЧЭННІ ПРАКТЫЧНЫХ КУРСАЎ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА Ў ВНУ

Акадэмічнае выяўленчае мастацтва ў кожнай краіне грунтуецца на культурна-адукацыйным вопыце, які на працягу многіх стагоддзяў быў назапашаны рознымі народамі ў розных геакультурных рэгіёнах свету. Таму асноўныя законы выяўленчага мастацтва маюць наднацыянальны, гуманістычны характар. Бясспрэчна і тое, што адным з вызначальных складнікаў мастацтва з'яўляецца нацыянальны кампанент. Ён праяўляецца як у тэматычна-вобразным змесце твора, так і ў асаблівасцях яго выяўленча-пластычнай структуры. У працэсе стварэння мастацкага твора нацыянальныя асаблівасці вобраза матэрыялізуюцца па-рознаму, бо непадобныя менталітэты творцаў, сацыяльна-эканамічныя ўмовы і нацыянальныя культурныя традыцыі тых або іншых краін. Мастацка-вобразныя рашэнні адной і той жа тэмы ў сучасным мастацтве маюць вельмі істотныя адрозненні, і гэта натуральна.

Беларуская акадэмічная мастацкая школа з прычыны вядомых гістарычных калізій не мае такой моцнай адукацыйнай сістэмы, як у суседніх краінах Заходняй Еўропы або Расіі. Нараджэнне прафесійнай мастацкай адукацыі ў нашым краі звязана з адкрыццём мастацкіх кафедраў у Віленскім імператарскім універсітэце на пераломе XVIII і XIX стст. Аднак той кароткі перыяд першай трэці XIX ст. застаўся ў гісторыі айчыннай культуры толькі яркім эпізодам, знакавай падзеяй на шляху фарміравання прафесійнай мастацкай адукацыі на Беларусі. Аналагічную ролю ў гісторыі айчыннай культуры адыграла таксама дзейнасць адукацыйных устаноў Віцебскай мастацкай школы ў пачатку XX ст. Аб рэальнай наяўнасці і функцыянаванні беларускай акадэмічнай школы выяўленчага мастацтва можна гаварыць толькі адносна перыяду другой паловы XX ст., калі ў Мінску пачаў рыхтаваць нацыянальныя мастацкія кадры Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, а ў Віцебску разгарнуў сваю дзейнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

мастацка-графічны факультэт педагагічнага інстытута. Менавіта гэтыя дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы, а таксама Мінскае дзяржаўнае мастацкае вучылішча імя А.К.Глебава стварылі сучасную сістэму прафесійнай мастацкай адукацыі ў нашай рэспубліцы. Сёння, калі спецыяльных навучальных устаноў значна больш, пытанне аб падрыхтоўцы ў дзяржаўных навучальных установах спецыялістаў мастацкіх спецыяльнасцей не страціла актуальнасці.

Для культурнай прасторы Беларусі гістарычна натуральным з'яўляецца наяўнасць рыс рускай, польскай, украінскай культур, а таксама краін Балтыі. Дамінуючы ўплыў беларускае выяўленчае мастацтва XIX ст. мела з боку польскай і моцнай сваімі традыцыямі рускай культур. Беларускае прафесійнае мастацтва фарміравалася паміж імі і змагло акумуліраваць у сабе рысы абедзвюх культур. Гэты гістарычны факт у мастацкай адукацыі савецкага часу амаль цалкам ігнараваўся. Зараз становішча змяняецца да лепшага, але феномен станаўлення беларускага прафесійнага мастацтва яшчэ не атрымаў дастатковага асэнсавання. Такі стан не дазваляе аб'ектыўна ацаніць вартасці нацыянальнай спадчыны. Вывучэнне і адбор прыкладаў з гісторыі сусветнага, еўрапейскага і айчыннага выяўленчага мастацтва ствараюць падставу для фарміравання цэльнага бачання ўзаемасувязі культур і аб'ектыўнага бачання самабытнасці беларускага мастацтва. Помнікі старажытнай архітэктуры, кніжнага мастацтва, творы жывапісу, графікі, скульптуры – усё разам гэта не толькі багаты іканаграфічны матэрыял у вывучэнні гісторыі мастацтва, малюнка, жывапісу, перспектывы, колеразнаўства, але і дзейсны сродак патрыятычнага выхавання творчай моладзі.

Яркіх, самабытных мастацкіх асоб у Беларусі ва ўсе часы было не мала. У творчасці кожнага з майстроў увасобіліся тыя ці іншыя характэрныя рысы беларускага выяўленчага мастацтва. Аналіз стылістыкі твора, манеры выканання разам з азнаямленнем з творчымі лёсамі мастакоў дазваляе не толькі набываць пэўныя прафесійныя навыкі, але і глыбей пазнаваць культурную спадчыну свайго краю: агульныя тэндэнцыі мастацтва, культурныя сувязі і ўзаемныя ўплывы мастацкіх школ. Прафесійнае сталенне творцы адбываецца разам з фарміраваннем яго этнічнай свядомасці, усведамленнем прыналежнасці да пэўнай нацыі і прыняццем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадзянскіх пазіцый сваёй краіны. На этапе акадэмічнага вучнёўства ў будучага мастака найбольш актыўна фарміруецца нацыянальны светапогляд. Вырашэнне гэтай задачы павінна адбывацца сістэмна як пры вывучэнні агульнаадукацыйных, так і спецыяльных мастацкіх дысцыплін. Метады навучання пры гэтым могуць быць самыя розныя – ад выкладання вучэбнага матэрыялу на нацыянальнай мове да спецыяльнага адбору дыдактычнага матэрыялу. Аб’екты культурнай спадчыны, якія вылучае педагог для выкарыстання ў якасці наглядных сродкаў, павінны быць усебакова асэнсаваны. У другой палове мінулага стагоддзя з’явілася шмат даследаванняў беларускіх мастацтвазнаўцаў (Н.Дробаў, В.Шматаў, Л.Налівайка, М.Паграноўскі, Н.Усава, Я.Шунейка, М.Баразна і многія інш.), якія змяшчаюць багаты факталагічны і аналітычны матэрыял для ўкаранення яго ў праграмы вучэбных курсаў спецыяльных навучальных установаў мастацкага профілю. Прывядзём толькі некаторыя імёны беларускіх мастакоў XIX ст., чые творы маглі б эфектыўна выкарыстоўвацца на практычных занятках па выяўленчым мастацтве, а біяграфічны матэрыял мог бы служыць дзейсным выхаваўчым сродкам, прыкладам адданага служэння творчай інтэлігенцыі свайму народу.

**Падалінскі** Міхал Дамінікавіч (1778–1856) – піянер беларускай станковай графікі, майстар медзярыту. Партрэтная серыя, прысвечаная прафесарам Віленскага універсітэта (“Партрэт Г.Гродэка”, “Партрэт Ю.Франка”, “Партрэт В.Герберскага” і інш.), з’яўляецца яркім узорам тэхнічнага майстэрства гравёра, вучыць уменню перадаваць складаную аб’ёмную пластыку сродкамі святлоценявой мадэліроўкі ў манеры чорнага штрыха. М.Падалінскі з’яўляецца таксама майстрам абрысавай гравюры, аб чым сведчаць яго ілюстрацыйныя афорты з карцін заходнееўрапейскіх мастакоў да каталога збору жывапісу ў Эрмітажы. Гэты графічны матэрыял можа з поспехам выкарыстоўвацца не толькі пры вывучэнні гісторыі айчыннага мастацтва, але і на практычных занятках па графіцы [3; 7].

**Дамель** Ян Крыштаф (1780–1840), жывапісец і рысавальшчык, аўтар шматфігурных кампазіцый на рэлігійную і гістарычную тэмы, афіцыйных партрэтаў-карцін, роспісаў храмаў і тэатральных дэкарацый. Жывапісныя палотны “Аўтапартрэт”, “Партрэт Ст.Богуша-Сестранцэвіча”, гістарычная кампазіцыя “Пераход

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напалеонаўскіх войскаў праз Бярэзіну”, “Адступленне французаў праз Вільню”, хуткія малюнкі жанравых сцэн, накіды жывёл і этнаграфічныя замалёўкі – багаты матэрыял для заняткаў па кампазіцыі ў выяўленчым мастацтве, натурным малюнку [1, с. 74–85; 4].

**Бахматовіч** Казімір (1808–1837), рысавальшчык, літограф, аўтар мініяцюрных малюнкаў бытавога жанру. Галоўнай справай жыцця мастака сталі альбомныя літаграфічныя серыі: “Успамін пра Дабраўляны” (1835), “Арласіяда” (1836), “Вільня” (1837), “Нязначныя ўражанні Я.Рустэма” (1837) і інш. Яго графічныя творы могуць быць каштоўнымі для студэнтаў на занятках па графіцы і малюнку не толькі ў пазнавальным аспекце сваім гістарычным і этнаграфічным зместам, але таксама і як узоры віртуознага выканання шматфігурных мініяцюрных кампазіцый у тэхніцы алоўка [ 1, с. 102–109; 5].

**Богуш-Сестранцэвіч** Станіслаў Станіслававіч (1869–1927), жывапісец, рысавальшчык. Пяро-туш – яго ўлюбёная тэхніка малюнка, дзе лінейны характар выявы, штрых, падобны на рысу штыхеля. Мастак рабіў з натуры хуткія накіды, дакументальныя этнаграфічныя замалёўкі, ілюстрацыйныя малюнкі ў газетах і часопісах, а таксама самастойныя станковыя аркушы-карціны, якія ў пачатку ХХ ст. былі пераведзены ў літаграфічную тэхніку і атрымалі шырокую вядомасць. Яго графіка і сёння выглядае надзвычай сучаснай і прывабнай, асабліва для тых, хто асвойвае майстэрства малюнка [6].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.Ромер. Вызваленыя. Папера, аловак. 1865

**Ромер** Альфрэд (1832–1894), жывапісец і графік. Яго мастацкая спадчына – гэта алоўкавыя, алейныя, акварэльныя і пастэльныя партрэты, гравюры, карціны рэлігійнай тэматыкі, краявіды, скульптуры, медальёны і інш. Асаблівая ўвага ў навучальным працэсе можа быць нададзена алоўкавым малюнкам і акварэлям, замалёўкам з альбомаў-дзённікаў, некаторым графічным аркушам, выкананым у тэхніцы літаграфіі, афорту, дрэварыту [ 1, с. 107–121; 2].

Спіс імёнаў выдатных беларускіх мастакоў можна было б яшчэ доўжыць і доўжыць, але гэта ўжо задача не артыкула, а вучэбнага дапаможніка, які можна было б выдаць у выглядзе альбома-хрэстаматыі твораў беларускага выяўленчага мастацтва для навучэнцаў мастацкіх спецыяльнасцей сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў Беларусі.

Выкладанне практычных курсаў выяўленчага мастацтва павінна прадугледжваць выкарыстанне багатага мастацкага вопыту, напрацаванага на роднай, нацыянальнай глебе. Педагагічная практыка паказвае, што такі метад дае істотныя станоўчыя вынікі. Па-першае, вырашаецца задача выхавання творчай моладзі ў духу нацыянальнага патрыятызму і гонару за культурную спадчыну свайго народа. Па-другое, забяспечваюцца міжпрадметныя сувязі паміж спецыяльнымі і агульнаадукацыйнымі дысцыплінамі (сусветная і айчынная гісторыя, культуралогія, этнаграфія і інш.). Па-трэцяе, ужо на этапе акадэмічнага навучання будучыя мастакі атрымліваюць урок зберагання і развіцця нацыянальных культурных традыцый, што з’яўляецца асновай фарміравання сувязі розных пакаленняў творцаў і сталення нацыянальнай школы мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Дробов, Л.Н.* Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л.Н.Дробов. – Мн.: Вышэйш. шк., 1974. – 336 с.

2. *Рынкевіч, У.* Графіка Альфрэда Ромера / У.Рынкевіч // Роднае слова. – 2002. – №3. – С. 80–84.

3. *Рынкевіч, У.* Пачынальнік вучонага гравёрства на Беларусі. Жыццё і творчасць Міхала Падалінскага / У.Рынкевіч // Роднае слова. – 2004. – № 8. – С. 83–88.

4. *Рынкевіч, У.* Ян Дамель – майстар хуткага малюнка / У.Рынкевіч // Роднае слова. – 2008. – № 6. – С. 92–95.

5. *Рынкевіч, У.* Увесь свет у мініяцюры. Да 200-годдзя Казіміра Бахматовіча / У.Рынкевіч // Роднае слова. – 2008. – № 8. – С. 83–86.

6. *Рынкевіч, У.* Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч – літвін па крыві і косці / У.Рынкевіч // Роднае слова. – 2008. – № 9. –   С. 95–97.

7. *Рынкевіч, У.І.* Міхал Падалінскі / У.І.Рынкевіч. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 40 с.: іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ